**Творчасць.** Урачыстая цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў літаратурнага конкурсу «Беларускі салавей», прысвечанага 135-годдзю з дня нараджэння Змітрака Бядулі, пройдзе 18 студзеня ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, паведамілі ў НББ. Конкурс праходзіў у межах праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» і быў аб'яўлены восенню мінулага года Нацыянальнай бібліятэкай пры ўдзеле газеты «Літаратура і мастацтва», «Настаўніцкай газеты», часопіса «Бярозка», Вялікага тэатра, Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра юнага гледача і іншых. Творчае спаборніцтва стала папулярным сярод шырокай аўдыторыі дзяцей і дарослых з розных куткоў Беларусі, а таксама прыцягнула ўвагу замежных удзельнікаў, адзначылі ў НББ.